Айцец Андрэй Буйніч




# НАТАТКІ ДА ГАМІЛІЙ

## (Перадпосце і Вялікі Пост)

2026 г.Б.

Слава Ісусу Хрысту!

Дарагія браты, сёстры і сябры!

Гэта другі сшытак маіх нататак да гамілій, прамоўленых у розныя часы падчас Боскай Літургіі пераважна ў парафіі святога Язафата ў Лідзе. Я называю гэта нататкамі, хоць большасць з гэтых тэкстаў амаль даслоўна супадае са словамі, якія прагучалі на Боскай Літургіі. Рэч у тым, што я перакананы: сам па сабе напісаны тэкст — гэта яшчэ не гамілія. Гамілія — гэта словы, звернутыя да вернікаў у канкрэтным літургічным і жыццёвым кантэксце. Вось чаму часам аднымі і тымі ж словамі можна прамовіць зусім розныя па духу гаміліі.

Гэтымі нататкамі я дзялюся з спадзяваннем, што яны натхняць чытача на ўласныя роздумы над Святым Пісаннем і на сузіранне. Калі нехта адчуе жаданне і будзе мець магчымасць падзякаваць мне за маё сціплае служэнне, то можа пачаставаць мяне

кавай, перайшоўшы па QR-кодзе. Іншы QR-код перанясе вас на мой YouTube-канал, дзе вы зможаце паслухаць гэтыя ды іншыя гаміліі, разважанні і катэхезы.

З удзячнасцю да кожнага чытача —

*а. Андрэй Буйніч.*

## Нядзеля Мытніка і Фарысея

(2 Цім 3, 1 - 15; Лк 18, 10 - 14)

Што такое быць пакорным? Хто ён такі, пакорны чалавек, і чым адрозніваецца ад іншых? Сучасная цывілізацыя накідвае нам сваё бачанне пакоры. Быць пакорным — не модна. Бо лічыцца, што быць пакорным — гэта быць пасіўным, «забітым», не мець свайго меркавання. Быць пакорным — значыць быць слабым. Пакора не пасуе сучаснаму чалавеку — чалавеку поспеху, моцы, кар’еры, матэрыяльнага дастатку; чалавеку, упэўненаму ў сабе. Аднак гэты вобраз пакоры — няпраўдзівы.

Сённяшні ўрывак з Евангелля падае нам сапраўдны вобраз пакоры. Дзве асобы — мытнік і фарысей — прыйшлі ў храм. Фарысей дзякуе Богу за тое, што ён не такі, як іншыя грэшнікі, а мытнік просіць пра літасць. Каму з іх не хапае адэкватнай самаацэнкі? І вось тут трэба адзначыць, што толькі Бог можа дапамагчы нам пабачыць сябе ў праўдзівым святле! Падобна да таго, як нам часам патрэбны лекар, каб ён мог паставіць правільны дыягназ, і мы не робім

гэтага самі — гэтак жа мы патрабуем Бога, бо толькі Ён — сапраўдны Лекар душ і целаў — можа даць нам пабачыць сябе такімі, якімі мы ёсць насамрэч.

Фарысей намагаецца сам сабе «паставіць дыягназ»: ён змяшчае сябе ў цэнтр сваёй малітвы, упэўнена пералічвае свае дабрадзейнасці, намагаецца быць сам сабе суддзёю, а больш за тое — сувора судзіць іншых... Мытнік — і ў гэтым яго пакора — адмаўляецца судзіць нават самога сябе. Аднак гэта не «заплюшчванне вачэй» на свае грахі і праблемы — гэта пошук праўды пра сябе ў Бога. Ён суадносіць сваю ўнутраную рэчаіснасць не са сваёй абмежаванай ацэнкай, але з рэчаіснасцю Божай Міласэрнасці. Менавіта пра такі яго настрой сведчаць словы: «Божа, будзь літасцівы да мяне, грэшнага!» (Лк 18,13).

«Божа, будзь літасцівы да мяне, грэшнага!» — гэта словы не «забітага» і не пасіўнага чалавека. Наадварот, каб сказаць гэтыя словы, трэба зрабіць сур’ёзны духоўны высілак, намаганне! Трэба адкрыцца, не саромецца паказаць свае раны і слабасці... У гэтых словах — дынаміка

нашага духоўнага жыцця, вобраз адносін паміж канкрэтнай асобай і нашым Богам, Лекарам і справядлівым Суддзёю. Гэтымі словамі мы дакранаемся да Таго, Каго немагчыма дакрануцца!

Аднак які рэцэпт «прапісаць» сучаснаму чалавеку? Як адказаць на пытанне: «Што мне зрабіць, каб стаць больш пакорным?» Мяркую, што першым крокам да пакоры з’яўляюцца сціплыя паводзіны. Будзь сціплым! Перастань думаць, што ты заўсёды маеш рацыю, стрымай свой язык, навучыся слухаць іншых, імкніся зразумець іх, асцерагайся паспешліва даваць ацэнку, май велікадушнасць і літасць да ўсіх, хто гэтага патрабуе. Амін.

**Нядзеля блуднага сына**

(1 Кар 6, 12 - 20; Лк 15, 11 –32)

Усім нам вядомая гэтая прыпавесць пра блуднага сына, а дакладней было б сказаць — прыпавесць пра двух блудных сыноў. Гісторыя гэтая вельмі драматычная. Можна было б заглыбляцца ў яе гістарычны і псіхалагічны кантэксты, але і без іх можам бачыць надзвычай вялікія рэчы, якія адкрывае нам Божае Словы.

Прыпавесць гэтую называюць «Евангеллем у Евангеллі». Яна стала ўсім вядомым вобразам, які распавядае пра сітуацыю грэшнага чалавека («і ён рады быў наесціся ражкамі, што елі свінні, але ніхто не даваў яму» (Лк 15,16)), і адначасова адкрывае нам, кім ёсць Бог.

Можа здзіўляць і захапляць адначасова той факт, што толькі ў Святым Пісанні мы даведваемся пра тое, што Бог з'яўляецца нашым любячым Айцом («І калі ён [малодшы сын] быў яшчэ далёка, угледзеў яго айцец яго і злітаваўся, і, пабегшы, кінуўся яму на шыю і цалаваў яго» (Лк 15,20)). Менавіта гэтае адкрыццё дае нам

вялікую надзею! Надзею на тое, што мы ў стане вытрываць нашую дарогу дадому — бо гэта дарога да нашага дому, да дому, дзе чакае Айцец. Айцец, а не чужы чалавек; Айцец, а не абстрактны Абсалют…

Жаданне вярнуцца дадому ўласцівае кожнаму чалавечаму сэрцу. Ужо Адысей, які намагаецца вярнуцца на сваю родную Ітаку, можа быць сімвалам чалавецтва, якое шукае шлях. Вяртанне да дому любячага Айца — гэта дарога, поўная невядомых прыгод і, канешне, небяспекі. Каб стаць на яе, трэба паглядзець на сябе па-іншаму: усвядоміць сваё становішча, захацець быць удзельнікам таямніцы… Вось як яе апісвае адна з песень на Вячэрні: «Пазнайма, браты, веліч тайны: усядобры Айцец сустракае і цалуе блуднага сына, які ад грахоў вярнуўся ў бацькоўскі дом; Ён дае яму зноў знак годнасці сваёй і тайна рыхтуе ў святліцы застолле, забіўшы кормнае цялё. Хай жа жыццё наша будзе годным чалавекалюбнага ахвяравальніка Айца і слаўнага Збавіцеля, які аддаў сябе на ахвяру за збаўленне душ нашых». Вяртанне да дому любячага Айца — гэта метаноя-пакаянне.

Абяцанне ўдзелу ў тайне заахвочвае да абуджэння, да змены мыслення, да пакаяння. Літургічны перыяд перадпосця — падрыхтоўкі да Вялікага посту — уводзіць нас па-настаўніцку, ад Нядзелі мытніка і фарысея праз Нядзелю блуднага сына — у духоўную прыгоду Вялікага посту. Хай гэта будзе час асабліва інтэнсіўнай працы над нашымі сэрцамі, час, калі мы адкінем усё, што нас абцяжарвае, і скіруем наш шлях да таямніцы Бога-Айца.

Дарагія браты, дарагія сёстры! Давайце ўсвядомім, што мы сапраўды з’яўляемся спадкаемцамі нашага Бога, што мы «куплены дарагою цаною» (1 Кар 6,20). Давайце будзем карыстацца тым, што Ён даў нам праз Царкву Хрыстову: Таямніцай Споведзі, Прычасцем, літургічнай малітвай, Святым Пісаннем. Праз гэтыя, здавалася б, вонкавыя знакі мы робімся ўдзельнікамі моцы Хрыстовай, што дапамагае нам сведчыць пра Божую міласэрнасць «чалавекалюбнага ахвяравальніка Айца». Амін.

**Нядзеля мясапусная, пра Страшны суд**
(1 Кар 8, 8 – 9, 2; Мц 25, 31 – 46).

«І пойдуць яны на вечную муку, а справядлівыя — у жыццё вечнае» (Мц 25,46).

Сёння мы перажываем трэцюю нядзелю перадпосця, якая называецца Мясапуснай або Нядзеляй пра Страшны суд. Чаго хоча нас навучыць наша літургія, прапануючы разважанне пра Страшны суд адразу пасля Нядзелі блуднага сына, калі мы бачылі Бога як міласэрнага Айца? Ці вобраз Бога як Праведнага Суддзі не супярэчыць вобразу Бога-Айца?

У прыпавесці, якую мы толькі што пачулі, Ісус кажа пра тое, што суддзёй будзе Сын Чалавечы, гэта значыць Ён сам. Цяжка ўявіць Збавіцеля ў такой ролі, і гэта прымушае нас задумацца сур’ёзна над справай Страшнага суда. Ісус Хрыстос дае празрысты крытэрый, на падставе якога будзе судзіцца кожны чалавек, і гэтым крытэрыем з’яўляецца спачуванне, эмпатыя.

На Судзе, як вынікае з прыпавесці, Суддзя не будзе пытацца пра грахі, якія

чалавек зрабіў падчас свайго жыцця, але пра тыя добрыя і неабходныя ўчынкі, якія чалавек не зрабіў свайму бліжняму. Больш за тое, спачуванне і службу іншаму чалавеку Ісус аргументуе вельмі нечакана: «Сапраўды кажу вам: што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, тое Мне зрабілі» (Мц 25:40).

Немагчыма любіць Ісуса і быць абыякавым да людзей вакол нас; немагчыма быць з Ісусам і заставацца далёкім ад тых, хто патрабуе спачування… Ёсць гісторыя пра настаўніка, які палохаў людзей Апошнім судом і пакутамі, што чакаюць грэшнікаў. У той час, калі ён так рабіў, іншы настаўнік праходзіў міма і ўсё чуў. «Не палохай людзей, — сказаў ён. — На Судзе Бог запытае толькі пра адно: "Сыне, Я быў з табою, а ты з кім быў?"»

Дарагія браты, дарагія сёстры! Гэтая гісторыя вучыць нас таму ж самаму, што і евангельская прыпавесць: мы выбіраем Валадарства, жыццё вечнае, тады, калі выбіраем Ісуса Хрыста. Ён заўсёды з намі: у нашых бацьках, у нашых дзецях, у нашым мужы ці жонцы, у нашых калегах па працы,

у нашых кіраўніках і падначаленых, у нашых сябрах і ворагах… Ён з намі. Без сумневу, сёння Слова Божае хоча задаць нам пытанне: а ты… з Ім? Амін.

## **Нядзеля сырапусная, прабачэння**

(Масленіца / Выгнанне Адама)
(Рым 13, 11 – 14:4; Мц 6, 14 – 21)

I.

Сёння Ісус звяртаецца да нас со словамі: «Бо калі вы будзеце дараваць людзям правіны іхнія, то даруе і вам Айцец ваш Небасячны; а калі не будзеце дараваць людзям правіны іхнія, то і Айцец ваш не даруе вам правін вашых» (Мц 6, 14 – 15).

Мы бачым, што паняцце прабачэння знаходзіцца ў шчыльнай сувязі з паняццем граху. Вось чаму тэксты вячэрні і ютрані нагадваюць нам біблейскую гісторыю — першародны грэх ды выгнанне з раю Адама і Евы. Што такое грэх? Памылка? Крыўда? Несправядлівасць? Мабыць, усё гэта, але не толькі. Бо грэх — гэта разарванне сувязі, еднасці, узаемаадносін з Богам.

Кагосьці можа здзівіць такое сцвярджэнне, але калі няма Бога, то няма і граху. Гэтую думку іншымі словамі выказаў Дастаеўскі: калі няма Бога, то ўсё дазволена. Вядома, можна казаць пра зорнае неба над галавой ды пра маральны закон унутры нас

(пар. Імануіл Кант). Але ў Канта гэтыя рэчаіснасці не звязаныя паміж сабой, а існуюць паралельна, незалежна адна ад адной. Падобна Канту, многія людзі перакананыя, што маральны закон — гэта іх уласнасць, што яны самі з’яўляюцца суддзямі і ў стане даваць абсалютную ацэнку таму, што ёсць дабром, а што — злом.

Для нас, хрысціян, «маральны закон ва мне» — гэта голас Бога ўнутры нас, інакш кажучы — сумленне. Але сумленне — гэта суб’ектыўная маральная норма. Іншымі словамі, часам наша сумленне можа памыляцца. Памятаем, як Ісус адказвае багатаму юнаку: «Чаму ты называеш Мяне добрым? Ніхто не добры, акрамя аднаго Бога». Ніхто не добры, акрамя Бога. Гэтае сцвярджэнне азначае, што маральны закон у сваёй поўні знаходзіцца ў Богу. І гэты закон Бог адкрывае нам праз сваё Адкрыццё — праз дзесяць запаведзяў, праз гісторыю збаўлення, праз Святое Пісанне, а ў поўні — праз свайго Сына Ісуса Хрыста.

Цяпер давайце зноў вернемся да прабачэння і падумаем: ці адрозніваецца

прабачэнне чалавека веруючага ад прабачэння чалавека неверуючага? Для веруючага чалавека прабачэнне бліжняму пачынаецца з прабачэння, якое ён атрымлівае ад самога Бога. Веруючы чалавек глядзіць на прабачэнне з пазіцыі даўжніка: ён сам быў вінаваты Богу, і гэты доўг быў скасаваны Хрыстом. Можна сказаць, што веруючы, з аднаго боку, можа «ўвайсці ў становішча» таго, хто просіць прабачэння, з другога боку — яму прасцей пабачыць уласныя правіны, бо ён не параўноўвае іх толькі з уласным сумленнем, але з Законам Божым.

Чалавек няверуючы сам з'яўляецца мерай і нормай: і для самога сябе, і для іншых. Як часта мне даводзілася чуць ад самых розных людзей, што нейкі чалавек варты смерці! Але ці ж гэта так? Ці гэта мы даем жыццё, каб мець права яго забіраць? Калі звяртаеш на гэта ўвагу, то чуеш у адказ: «Але ён забойца, ён гвалтаўнік і гэтак далей». І гэта можа быць праўдай, аднак гэтую рэчаіснасць цяжка супаставіць з іншай: жыццё і смерць не належаць нам. Мы не можам стаць падобнымі да Бога ў

пытаннях жыцця і смерці, але мы можам стаць падобнымі да Яго ў прабачэнні. Давайце прабачаць тым, хто нас пакрыўдзіў, бо Бог першым прабачыў нас.

II.

Сённяшняя нядзеля, апошняя перад Вялікім постам, называецца Нядзеляй прабачэння. Нездарма мы згадваем пра прабачэнне менавіта цяпер. Прабачэнне — гэта дзверы, праз якія мы мы можам выйсці на дарогу малітвы, духоўнага жыцця, пазнання самога сябе і Бога. А самае галоўнае, што прабачэнне з’яўляецца дзвярыма ў Божае Валадарства. Сёння Ісус звяртаецца да нас словамі: «Бо калі вы будзеце даравацъ людзям правіны іхнія, то даруе і вам Айцец ваш Нябесны; а калі не будзеце даравацъ людзям правіны іхнія, то і Айцец ваш не даруе вам правін вашых» (Мц 6, 14 – 15).

Прабачэнне заўсёды актуальнае: ці ж ёсць чалавек, які можа засведчыць, што ўсё ўсім прабачыў? Канечне, не. Непрабачэнне тоіцца ў закутках нашых сэрцаў. Яно паралізуе нашую волю і ініцыятыву, адымае

ў нас радасць. Гэтая нядзеля нагадвае нам і дае шанец паўстаць «ад сну» непрабачэння, зрабіць рашучы крок і адчыніць дзверы, за якімі пачынаецца свабода духу.

Распавядаюць гісторыю, што аднойчы пэўная вядомая артыстка, зайшоўшы ў грымёрку і пабачыўшы сваіх калег, якія з імпэтам штосьці абмяркоўвалі, запытала: «Супраць каго сябруем, дзяўчаты?» Сапраўды, непрабачэнне можа набываць розныя формы. Аднак найбольш небяспечным відам непрабачэння з’яўляецца непрабачэнне самому сабе. Чаму так цяжка сабе прабачыць?

Справа ў тым, што прабачэнне грунтуецца на факце Божай міласэрнасці. Калі мы не хочам прабачыць іншаму чалавеку, то гэтым мы адмаўляем тое, што Бог міласэрны ў адносінах да яго. Калі мы не хочам прабачыць сабе, гэта азначае, што мы адмаўляем міласэрнасць Бога ў адносінах да нас. Ці будзем мы ўпарта паўтараць: «Божа, Ты не міласэрны да яго!» або «Божа, Ты не міласэрны да мяне!»? Мы не хочам паверыць у Божую міласэрнасць. Нам лягчэй паверыць, напрыклад, што мы

«не маем віны», ці «не нясем адказнасці», ці «вінаватыя ўсе, акрамя мяне»... Аднак калі нашы грахі і памылкі відавочныя, то мы застаёмся з імі і робімся самі сабе суддзямі. Гэта вельмі страшна — быць сабе суддзёю. Часам мы можам быць справядлівымі суддзямі, але ніколі — міласэрнымі.

Як бачым, прабачэнне — гэта таксама справа веры; веры ў тое, што Бог з’яўляецца крыніцай міласэрнасці і даравання. Давайце яшчэ і яшчэ адкрываць яе для сябе. Гэта не аднаразовае дзеянне. Можа, хто-небудзь з нас мае патрэбу скласці спіс асоб, якім яшчэ не прабачыла яго сэрца, і штодзённа маліцца за іх. Можа, такі спіс варта зрабіць кожнаму з нас? Давайце прабачаць! Калі мы прабачаем, мы становімся падобнымі да Бога. Сёння пасля Боскай літургіі будзе час, каб папрасіць прабачэння адзін у аднаго. Давайце скарыстаемся магчымасцю ў сваім прабачэнні стаць такімі як Бог! Амін.

## Першая нядзеля Вялікага Посту, праваслаўя

(Гбр 11, 24 – 26; 11, 32 – 12, 2; Ян 1, 43 – 51)

I.

Падчас малітвы Вялікага пакаяннага канона ў першыя дні посту мы шмат чулі пра сузіранне. Вось, напрыклад, што кажа святы Андрэй Крыцкі на прыкладзе гісторыі пра дзвюх жонак патрыярха Якуба: шматдзетную Лію і каханую Рахіль, якую доўгі час лічылі бясплоднай: «Пад дзвюма жонкамі разумей дзеянне і веду праз сузіранне. Лія — гэта дзеянне, бо яна была шматдзетнаю; а Рахіль працалюбная — гэта веда. Бо без працы і высілку, душа мая, няма ні дзеяння, ні сузірання».

Сузіранне — гэта такая хрысціянская практыка, яка апошнім часам часта застаецца па-за межамі нашай увагі. Мы больш займаемся дабрачыннасцю, чытаем і вывучаем Святое Пісанне, молімся, рыхтуемся і прыступаем да Тайны Пакаяння. Усё гэта — праца і высілкі, пра якія кажа святы Андрэй, але ж яны мусяць

прывесці нас да сузірання, без якога мы не будзем ведаць Бога.

Першая нядзеля Вялікага посту ў нашай традыцыі называецца Нядзеляй Праваслаўя. Гэтае свята было ўстаноўлена ў IX стагоддзі, калі на хрысціянскім Усходзе распаўсюдзілася ерась іканаборства. Іканаборцы сцвярджалі, што недапушчальна ствараць выявы Хрыста, Багародзіцы і іншых святых, бо гэта ідалапаклонства.

Аднак тыя, хто трымаўся спрадвечнай хрысціянскай традыцыі (іх і называлі праваслаўнымі), вучылі, што іконы патрэбныя нам, бо, пакланяючыся вобразу, мы на самай справе аддаем пашану Таму, Хто намаляваны, альбо, больш дакладна, напісаны.

У нашых храмах ёсць шмат іконаў. Яны маюць розную гістарычную ці мастацкую каштоўнасць, рознымі шляхамі з’явіліся ў цэрквах і капліцах. Але ўсе яны маюць важную духоўную каштоўнасць — выяўляюць нам Уцелаўлёнага Госпада, Яго Маці ці святых. Іконы — не проста элемент дэкору, яны і ёсць прадмет сузірання. Сузіранне — гэта праца вачэй і розуму: мы

бачым вачыма выяву, і яна нагадвае нам пра гісторыю збаўлення, пра ахвяру Госпада, пра апеку Багародзіцы, подзвіг святых. Сціж за розумам мы «ўключаем» сэрца ды адчуваем удзячнасць Госпаду альбо Багародзіцы, захапляемся гераізмам святых. І апошні этап — прымаем канкрэтныя рашэнні, як нам стаць больш падобнымі да Хрыста, Яго Маці ці вучняў.

Ці ёсць у вас дома ікона? Напэўна, ёсць. Давайце паспрабуем на гэтым тыдні зрабіць такое практыкаванне: прынамсі пяць хвілін пасядзім, углядаючыся ў яе, і паслухаем, што прамовіць да нас Госпад падчас гэтага сузірання. Амін.

## II.

Першая нядзеля Вялікага посту называецца Нядзеляй Праваслаўя. Сёння мы прыгадваем, што ў першай палове IX стагоддзя Царква ўрачыста абвясціла сваю перамогу над рознымі ерасямі, а асабліва — над ерассю іканаборства. Іканаборцы былі супраць шанавання ікон; яны лічылі, што гэта ідалапаклонства. Царква ж нас вучыць, што з ідалапаклонствам мы маем справу

тады, калі месца праўдзівага Бога займае хтосьці або штосьці іншае. Ікона ў нашай літургічнай пабожнасці не займае месца Бога: мы пакланяемся не самой іконе, але Богу. Ікона — гэта толькі сродак; акно, праз якое мы намагаемся бачыць духоўны свет і духоўныя рэчы.

Цікава, што сёння — у Нядзелю Праваслаўя — літургія прапануе нам разважаць над фрагментам Евангелля паводле Яна. Толькі што мы сталі сведкамі таямнічага дыялогу паміж Ісусам і Натанаілам. Ісус кажа: «Вось сапраўдны ізраільцянін, у якім няма крывадушнасці». Натанаіл пытаецца: «Адкуль Ты ведаеш мяне?» Ісус адказвае: «Перш чым Піліп паклікаў цябе, Я бачыў цябе, калі ты быў пад смакоўніцаю». Тады Натанаіл усклікнуў: «Раввi! Ты Сын Божы, Ты Цар Ізраілеў!» (пар. Ян 1, 47 – 49).

Пра што ж ідзе тут гаворка, што гэта за смакоўніца і калі Ісус меў магчымасць бачыць Натанаіла? Можам паспрабаваць прыадчыніць заслону таямніцы і, прынамсі часткова, адкрыць для сябе значэнне гэтай нявыказанай сувязі, якую нам удалося

намацаць; сувязі, што злучала Ісуса ды Натанаіла. Па-першае, Натанаіл быў перакананы, што ніхто не мог бачыць яго пад смакоўніцай, інакш словы Хрыста яго б не ўразілі. Па-другое, словы Натанаіла, якімі ён звяртаецца да Ісуса, паказваюць на яго веру ў тое, што Ісус з'яўляецца Месіяй. Гэта азначае, што Натанаіл быў перакананы: Ісус ведаў нешта надзвычай важнае, што адбылося пад смакоўніцай.

Бяручы пад увагу ўсё вышэйзгаданае, мы можам меркаваць, што гэтай надзвычай важнай рэччу, якую ніхто з людзей не мог бачыць, была таемная малітва Натанаіла. Шчыры ізраільцянін недзе далёка ад людзей пад смакоўніцай маліўся і меў досвед сустрэчы з Богам. Вядома, мы не можам ведаць, што гэта быў за досвед, але напэўна ён быў звышнатуральным, містычным… І ось, калі Збавіцель сказаў, што бачыў яго пад смакоўніцай, Натанаіл у сваю чаргу «разгледзеў», пазнаў у гэтым сваім вопыце Месію-Ісуса.

Гісторыя Натанаіла — гэта сапраўдная гісторыя богапазнання, і невыпадкова, што гэты ўрывак Евангелля чытаецца сёння, у

Нядзелю Праваслаўя. Урачыстасць Праваслаўя — гэта свята перамогі праўдзівага богапазнання ў жыцці кожнага хрысціяніна. Яно з’яўляецца ўдзелам не толькі выбраных, але кожнага чалавека, які, падобна Натанаілу, шчыры ў сваіх пошуках.

Сам Госпад пацвярджае даступнасць богапазнання і заахвочвае нас да яго, кажучы: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: адгэтуль будзеце бачыць неба адчыненае і анёлаў Божых, якія ўзыходзяць і сыходзяць да Сына Чалавечага» (Ян 1, 51).

Хай жа гэтыя словы натхняюць нас на дарозе Вялікага посту, які мы распачалі; а натхненне знаходзіць выраз у канкрэтных учынках: удзеле ў Тайне Споведзі, міласціне, знаходжанні часу для глыбейшай малітвы. Перш за ўсё давайце будзем прасіць Госпада пра дар шчырасці, каб нам адкрыць ікону Ісуса Хрыста ў сваім сэрцы і разам з Натанаілам усклікнуць: «Раввi! Ты Сын Божы, Ты Цар Ізраілеў!» Амін.

## Другая нядзеля Вялікага Посту

(Гбр 1, 10 – 2, 3; Мк 2, 1 – 12)

Сёння мы нашымі духоўнымі вачыма бачым евангельскую сцэну: праз раскрыты дах дома да Ісуса апускаюць пасцель са спаралізаваным. Шмат сэнсаў мы можам адкрыць, сузіраючы сённяшні фрагмент Евангелля. Мы можам падзівіцца рашучасці сяброў, якіх не спыніў ні цяжар сябра, якога яны неслі, ні натоўп вакол дома, ні дах, які ім давялося разабраць. Мы можам разважаць пра спаралізаванага і задавацца пытаннем, якімі якасцямі сваёй асобы ён здабыў сабе такіх верных сяброў.

Аднак усё ж у цэнтры евангельскай падзеі як маланка ззяюць словы Госпада, якія Ён кажа спаралізаванаму: «Сыне, адпускаюцца табе грахі твае!» Гэтыя словы справакавалі кніжнікаў на думкі пра блюзнерства і да пытання: «Хто можа адпускаць грахі, акрамя аднаго Бога?» Гэтыя словы Ісуса правакуюць і нас: чаму Настаўнік не ідзе простай сцежкай — чаму наўпрост не аздаравіць таго, каго неслі, цягнулі на дах і ўрэшце амаль скінулі да Яго

ног? Аднак гэта не пакручастая сцежка разважанняў нашага Госпада — гэта простая, як страла ў палёце, сутнасць Яго прыроды. Яго Боскай натуры, натуры Лекара, Які хоча аздаравіць усяго чалавека, а не толькі яго цела.

Гэта інтэгральнасць, якую Ён намагаецца патлумачыць кніжнікам, выражаецца ў пытанні да іх: «Што лягчэй? Сказаць спаралізаванаму: „адпускаюцца табе грахі“, ці сказаць: „устань, вазьмі пасцель сваю і хадзі“?» Можна было б па-іншаму задаць кніжнікам гэтае пытанне: хто можа вярнуць чалавеку здароўе? Ці ж не толькі адзіны Бог? Адказ на пытанне кніжнікаў станоўчы: толькі Бог можа адпускаць грахі, гэтаксама як толькі Бог можа вяртаць здароўе чалавеку. І гэтым Богам з’яўляецца Сын Чалавечы — Ісус Хрыстос.

Сёння, стоячы ў натоўпе і бачачы ўсё, што робіць Ісус, будзьма ўдзельнікамі гэтага адкрыцця, прычаснікамі нябачнага святла, што сыходзіць ад Госпада, які кажа: «Адпускаюцца табе грахі твае!». Амін.

## Трэцяя нядзеля
## Вялікага Посту, крыжапаклонная
(Гбр 4, 14 – 5, 6; Мк 8, 34 – 9,1)

Мы перажываем палову Вялікага Посту. Гэты літургічны перыяд Айцы Царквы называлі «духоўнай вясной».

Мы распачалі таксама нядаўна вясну астранамічную, пра якую наш зямляк Уладзіслаў Сыракомля склаў выдатны верш (дазволю сабе вам яго прачытаць):

*Ужо птушкі пяюць ўсюды,*
*Ужо кветкі зацвілі...*
*«Вясна прыйдзе», — кажуць людзі...*
*Ды скуль прыйдзе і калі?*
*І нашто ж вясна нам, Божа?*
*Мы адвыклі ад вясны...*
*Елкі ў лесе, мох на стрэце*
*Зелянеюць заўсягды…*

Такім чынам, праз параўнанне разумеем, што нашая духоўная вясна — Вялікі Пост — гэта таксама такі перыяд, калі нашая чалавечая прырода абуджаецца да жыцця. Гэты перыяд — гэта не толькі (і не столькі) час горкага эгацэнтрычнага жалю за свае грахі, але таксама (або перш за

ўсё) цішай унутранай радасці з-за таго, што мы можам узяць удзел у гісторыі перамогі; гісторыі, праз якую вядзе нас наш Госпад.

Мы сапраўды бяром удзел у гэтай радасці праз богаслужэнні, праз нашыя нават мінімальныя аскетычныя высілкі, праз удзел у Таямніцы Споведзі ды праз нашыя ўлюбёныя посныя малітвы, такія як, напрыклад, малітва Яфрэма Сірына.

І вось вянцом і знакам Вялікай Перамогі ёсць Крыж нашага Госпада Ісуса Хрыста, якому мы сёння радасна кланяемся і праслаўляем. Адказваючы на рэтарычнае пытанне Сыракомлі: навошта нам вясна? — давайце далучым нашыя сэрцы да воклічу, які знаходзіцца ў прычасніку сённяшняй Боскай Літургіі: “Хай заззяе нам святло аблічча Твайго, Госпадзе. Алілуя, алілуя, алілуя”.

**Чацвёртая нядзеля**
**Вялікага Посту, Яна Лесвічніка**
(Габ 6, 13 – 20; Мк 9, 17 – 31)

Да каго Ісус у толькі што прачытаным фрагменце Евангелля так незразумела, а нават крыўдна, звяртаецца: «О, род няверны! Дакуль буду з вамі? Дакуль буду цярпець вас?» (Мц 9, 19)? Быць можа, Ён звяртаецца да бацькі апантанага хлопца, ці да сваіх вучняў, ці да іншых прысутных людзей? Цяжка на гэта адказаць. Хутчэй за ўсё, Ён звяртаецца да кожнага з нас, хочучы звярнуць нашую ўвагу на тое, што кожны з нас мае праблемы з верай.

Цікава заўважыць, што нашая вера (ці яе адсутнасць) найбольш яскрава праяўляецца ў сітуацыях крытычных: у крызісе, у бядзе. Вось і тут, паглядзіце! Некаторыя людзі прыйшлі проста паглядзець на цуд, які меліся ўчыніць вучні Ісуса. Самі вучні прыйшлі, каб паказаць саміх сябе, якія яны цудатворцы і якую маюць уладу… Кніжнікі прыйшлі, каб пасмяяцца з вучняў: яны ад самага пачатку супраць усяго таго, чаго б ні зрабілі вучні

(нават калі б і здзейснілі цуд)… Карацей кажучы, усе яны забыліся пра хлопца, які чакаў аздараўлення. Толькі бацька хлопчыка і Ісус памяталі пра яго, і толькі яны зацікаўленыя яго будучыняй.

У такім кантэксце робіцца зразумелым абурэнне Ісуса Хрыста. Пасля Яго суворых слоў усе асобы нібы знікаюць з евангельскай сцэны: застаюцца толькі Ісус ды бацька. Ісус падрабязна распытвае ў бацькі пра хваробу сына не таму, што не мог пра яе даведацца, чытаючы ў яго сэрцы, але дзеля таго, каб паказаць яму, што Ён — Ісус — вельмі сур'ёзна ўспрымае ўсю іх сямейную бяду (у адрозненне ад вучняў, кніжнікаў ды іншых разявак). Бацька адказвае і просіць дапамагчы. Ісус кажа яму: «калі можаш верыць, усё магчыма для веруючага» (Мц 9, 23).

Гэтымі словамі Госпад нібы падкрэслівае, што для Яго вельмі важна, каб сам бацька ўзяў на сябе адказнасць веры ў аздараўленне свайго сына, а ніхто іншы. І бацька гэта разумее, вызнаючы: «Госпадзе, памажы майму няверству!» (Мк 9, 24).

Адбываецца цуд: Ісус выганяе нячыстага духа…

Сёння мы пакліканы прыгледзецца да нашай веры. Да веры вучняў, кніжнікаў ці да веры разявак падобная яна? Ці мы гатовыя ўзяць на сябе адказнасць за іншых людзей: сваю сям’ю, родных, супрацоўнікаў, за свае ўчынкі, памылкі… Не будзем наіўна думаць, што зможам гэта зрабіць уласнымі намаганнямі; наш Госпад падказвае нам: «гэты род ніяк не можа выйсці, адно толькі ад малітвы ды ад посту» (Мк 9, 29). Амін.

**Пятая нядзеля**
**Вялікага Посту, пач. Марыі Егіпецкай**
(Габ 9, 11–14; Мк 10, 32–45)

Сёння мы з’яўляемся сведкамі канфлікту, які ўзнікае паміж вучнямі Ісуса Хрыста падчас іх падарожжа. Прыглядзімся, што адбываецца: Ісус ідзе ў Іерусалім. Вучні неахвотна, а нават з жахам, цягнуцца за ім.

Яны вельмі добра ведаюць аб небяспецы, якая чакае Ісуса ў Іерусаліме, а значыць — і ўсіх вучняў. Уся іх істота бунтуецца: не разумее і не прымае такое рашэнне Настаўніка. Ісус жа ўжо ў трэці раз (у Евангеллі паводле Марка) тлумачыць, што Ён мае быць выдадзены на смерць і на трэці дзень уваскрэснуць. Вучні быццам бы не чуюць гэтых слоў. Ці палесцінскае сонца ў той дзень паліла з асаблівай моцай, і мары, якія яны мелі перад сваімі вачыма, былі больш рэальнымі, чым тое, што казаў Ісус?..

Падыходзяць Якаў ды Ян і просяць пра першыя месцы (па правым і левым боку) каля Ісуса. Госпад лагодна скіроўвае іх думкі ізноў да тэмы смерці: “Не ведаеце, чаго просіце; ці ж можаце піць чашу, якую

п’ю Я, і хрысціцца хрышчэннем, якім Я хрышчуся?” (Мк 10, 38). Келіх ды абмыццё вадою (хрышчэнне) — гэта сімвалы-знакі мучаніцтва, добра вядомыя вучням са Старога Запавету. Напэўна, можна перафразіраваць словы Госпада наступным чынам: не ведаеце, чаго просіце; ці вы можаце ісці дарогай мучаніцтва, як Я? Магчыма, Госпад меркаваў, што думкі аб мучаніцтве і смерці вернуць вучняў на цвёрдую глебу рэчаіснасці, дапамогуць па-іншаму асэнсаваць вартасць зямной славы…

Хто ж можа адказаць на такое пытанне (аб мучаніцтве і смерці) без глыбокага папярэдняга разважання? Не ведаем, ці Якаў з Янам зразумелі Ісуса ў той момант, аднак яны бадзёра адказваюць Яму: “Можам!” Госпад не звяртае ўвагі на дзёрзкасць і неабдуманасць гэтых слоў; ведаючы, што амаль усе Ягоныя вучні прымуць мучаніцкую смерць, Ён згаджаецца з імі.

Працягваючы гаварыць да іх, Ісус кажа таксама сваё “але”: “Сесці ў Мяне з правага боку і з левага – не Мне даваць, але каму прыгатавана” (Мк 10, 40). Госпад не запярэчвае, што існуюць пачэсьныя месцы

каля Яго ў Божым Валадарстве, аднак чарговы раз хоча падкрэсліць, што іерархія ў Божым Валадарстве зусім іншая. Бачачы абурэнне з боку іншых вучняў на сваіх таварышаў, Ісус падрабязна тлумачыць, як можна заняць першыя месцы.

Ён Сам, Настаўнік, “прыйшоў не каб Яму служылі, але каб паслужыць і аддаць душу Сваю на выкупленне многіх” (Мк 10, 45), таму ёсць толькі адзін спосаб быць побач з Ісусам (праваруч і леваруч ад Яго) — “хто хоча стацца першым між вамі, хай будзе слугою ўсіх” (Мк 10, 44).

Дарагія браты, дарагія сёстры... Так цяжка быць слугою нават аднаго блізкага чалавека! Хто можа сказаць пра сябе, што ён слуга сваёй жонкі, што яна слуга свайму мужу? Ці мы можам сказаць, што мы слугі сваіх бацькоў? Служыць іншаму чалавеку няпроста: трэба ж не чакаць ад яго падзякі; ці не чакаць таго, каб ён ацаніў, што ВЫ для яго зрабілі. Калі мы любім і служым, то мы ідзем шляхам мучаніцтва. Ці мы свядомыя гэтага і ці мы гэтага жадаем?

**Уваход Госпада нашага Ісуса Хрыста ў Ерусалім, Вербная нядзеля**

(Плп 4, 4 – 9; Ян 12, 1 - 18)

Вось мы і дажылі до Вербнай нядзелі, калі ўзгадваем Уваход нашага Госпада Ісуса Хрыста ў Іерусалім. Сусветная пандэмія многім з нас дапамагла больш сур'ёзна, больш паважна перажыць гэты Вялікі Пост.

Святое Пісанне параўноўвае пост да пустыні, дзе няма вады, а значыць — і жыцця. Падчас гэтага Вялікага Посту і мы адчулі недахоп вады. Канечне, не літаральна, а ў пераносным сэнсе. Мы адчулі, што нам не хапае ўпэўненасці ў будучыні. Мы не ўпэўненыя, ці заўтра не захварэем, ці будзем наогул жывыя. Ці будуць здаровымі і жывымі нашыя родныя, блізкія і сябры… Пандэмія абвастрыла ў нас пачуццё крухкасці чалавечага жыцця — мы пачалі часцей званіць сваім пажылым бацькам і турбавацца пра іх здароўе, мы пачалі часцей маліцца адзін за аднаго, прысвячаць час сваім сем'ям.

Сусветны крызіс змусіў нас задумацца таксама пра нашыя гаманцы. Некаторыя з

нас згубілі або згубяць працу — гэта нас моцна турбуе, асабліва мужчын, якія збольшага забяспечваюць дабрабыт сваіх сем'яў. Мы, беларусы, і раней не былі схільнымі да таго, каб выдаваць вялікія грошы, але цяпер яшчэ больш задумаемся над тым, якія рэчы варта купіць, а ад якіх трэба адмовіцца… Сітуацыя, у якой мы апынуліся, дапамагае нам пераасэнсаваць нашую сістэму каштоўнасцей: ці тое, што раней было важным для мяне, усцяж застаецца для мяне актуальным і важным? Менавіта такое пытанне паставіў перад жыхарамі Іерусаліма Ісус. Як гэта так, можаце запытацца вы? А вось як.

Звычайна важныя асобы (прэзідэнты, каралі ці прэм'ер-міністры) уязджаюць у сталіцу з помпай: самі на дарагіх аўтамабілях, побач з імі машыны суправаджэння з мігалкамі… Але Ісус-Кароль, Уладар Сусвету, хоць таксама ўрачыста ўязджае ў горад Іерусалім, але робіць тое на асле. Гэтым Ён нібы гаворыць: у мяне іншая сістэма каштоўнасцей, ці гатовыя вы яе прыняць? А сапраўды, ці гатовыя мы прыняць сістэму каштоўнасцей

Ісуса? Сістэму, у цэнтры якой знаходзіцца не нашае «я», але «ты», асоба і дабро іншага чалавека.

Пост скончыўся. Але, магчыма, яшчэ не скончыліся нашыя праблемы. Ды зноў жа — нічога не вядома пра нашую будучыню, за выключэннем толькі аднаго: у гэтай будучыні мы можам перамагчы нашыя злыбеды дзякуючы салідарнасці, узаемнай ахвярнасці ды ўражлівасці на іншага чалавека.

Міне пяць дзён, і мы будзем вітацца словамі «Хрыстос уваскрос!». Дык хай же Той, хто аднойчы ўваскрос — уваскрашае нас для служэння нашым блізкім і далёкім, каб гучнае рэха ў кожным сэрцы адказвала нам: «Сапраўды ўваскрос!»